# ТРАДЫЦЫЙНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ

ТОМ 6

## Гомельскае Палессе і Падняпроўе

У дзвюх кнігах

*кніга* 1

Мінск «Вышэйшая школа» 2012

УДК 39(=161.3)+398.3+392](476.2)
ББК 63.5(4Беи)
Т65

Аўтары:
Т.В. Валодзіна, Т.Б. Варфаламеева, М.А. Козенка, Т.І. Кухаронак, І.В. Мазюк,
І.Ю. Смірнова, В.С. Цітоў

Ідэя і агульнае рэдагаванне:
Т.Б. Варфаламеева

Фота:
А.У. Белавусаў, А.М. Боганева, І.І. Бышнёў, Т.В. Валодзіна, У.А. Ганчар, Л.Л. Грыб,
П. Каладзейчык, М.А. Козенка, В.А. Красулін, Т.І. Кухаронак, В.А. Лабачэўская,
Т.М. Мармыш, В.В. Пранкевіч, В.М. Прыбылова, І.Ю. Смірнова

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук А.С. Ліс,
доктар філалагічных навук А.У. Марозаў

Рэкамендавана да выдання навуковым саветам дзяржаўнай навуковай установы "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі"

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

*Усе правы на дадзенае выданне абаронены. Узнаўленне ўсёй кнігі ці любой яе часткі не можа быць ажыццёўлена без дазволу выдавецтва*

**ISBN 978-985-06-2201-3 (т. 6, кн. 1)**

© Выдавецтва "Вышэйшая школа", 2012

# ПРАДМОВА

Гэты том завяршае шасцітомнае выданне “Традыцыйная мастацкая культура беларусаў”, прысвечанае даследаванню сучаснага стану карэнных формаў народнай культуры кожнага з шасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі[1]. У ім прадстаўлена аўтэнтычная народная культура паўднёва-заходняй часткі нашай краіны – Гомельскага Палесся і Падняпроўя, якая вызначаецца выключным багаццем, яскравай самабытнасцю і маляўнічасцю.

Том грунтуецца на матэрыяле шматлікіх фальклорна-этнаграфічных экспедыцый (асноўныя з іх адбыліся ў 2003–2004 гг., дадатковыя праводзіліся і пазней), у ходзе якіх аўтарскім калектывам былі даследаваны ўсе раёны Гомельскай вобласці, дзе сабраны аб’ёмны арыгінальны матэрыял па ўсіх асноўных відах і жанрах традыцыйнай народнай культуры.

Згодна з прынятай у дадзенай серыі канцэптуальнай устаноўкай на вывучэнне рэгіянальнай аўтэнтычнай культуры беларусаў, яна і ў гэтым томе разглядаецца ў адзінстве такіх асноўных падыходаў, як комплексны, сінхронны і этнапсіхалагічны. У адпаведнасці з першым спецыфічны характар народнай мастацкай культуры кожнага з рэгіёнаў праяўляецца ў сукупнасці шэрагу прыкмет, сярод якіх галоўнымі з’яўляюцца суадносіны ў кожнай з галін аўтэнтычнай культуры ранняга і позняга гісторыка-стылявых пластоў; асаблівасці сістэмы традыцыйных абрадаў на дадзенай тэрыторыі і структура гэтых абрадаў; перавага пэўных формаў і жанраў у розных відах народнай творчасці і мясцовае асэнсаванне формаў і жанраў, якія маюць агульнабеларускае пашырэнне; характар іх распаўсюджання (арэальны аспект); стылявыя асаблівасці і асаблівасці выканальніцтва (вытворчасці) ва ўласна мастацкіх відах творчасці; народныя тэрміналагічныя вызначэнні тых ці іншых з’яў мясцовай народнай культуры.

---

1 Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.1. Магілёўскае Падняпроўе. Мінск, 2001; Т.2. Віцебскае Падзвінне. Мінск, 2004; Т.3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Мінск, 2006; Т.4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1. Мінск, 2008; Кн. 2. Мінск, 2009; Т.5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1. Мінск, 2010; Кн. 2. Мінск, 2011.

Сінхронны падыход (прадугледжвае вывучэнне вясковых знаўцаў мясцовай аўтэнтычнай культуры як структурнага адзінства) дазваляе вызначыць, з аднаго боку, асаблівасці сучаснага стану традыцыйнай культуры рэгіёна, з другога – дыяхронную разнастайнасць праяў гэтай культуры, якая стагоддзямі фарміравалася ў рэгіёне Гомельскага Палесся і Падняпроўя, склаўшы ў выніку сучасны культурны ландшафт з усёй яго спецыфічнасцю ў параўнанні з адпаведнымі культурнымі ўтварэннямі іншых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі.

Этнапсіхалагічны аспект раскрываецца як узаемазвязанае адзінства трох кампанентаў: кагнітыўнага (адлюстраванне ўяўленняў чалавека “аб свеце і аб сабе”), эмацыянальна-аксіялагічнага (адносіны да сябе, да іншых людзей, ацэнка з’яў і падзей аўтэнтычнай мясцовай культуры) і паводзінскага (стаўленне да агульнапрынятых нормаў і стандартаў паводзін, асабліва ў абрадавай культуры). Пры гэтым роўная ўвага ўдзяляецца як актыўным, так і пасіўным формам існавання традыцыі. Згодна з першай формай, традыцыі ў натуральным выглядзе працягваюць жывое існаванне ў сучасным побыце вяскоўцаў і вылучаюцца значнай ступенню самаарганізаванасці; згодна з другой – жыццё традыцыі працягваецца толькі ў памяці старэйшага пакалення сельскіх жыхароў, памяці, якая ўтрымлівае падрабязныя звесткі аб самых розных праявах традыцыйнай культуры, што яшчэ зусім нядаўна былі для гэтых людзей натуральным жывым асяроддзем. Абедзве гэтыя формы сведчаць як пра тое, што энергія культурных традыцый народа далёка не вычарпана і карэнны вясковы беларус да нашага часу застаецца прыхільнікам і захавальнікам сваёй культуры, так і пра існаванне моцнага ментальнага падмурку для працягу жыцця традыцыі ў новых жыццёвых умовах і ў новых пакаленнях беларусаў.

Спецыфіка народнай культуры даследуемага рэгіёна вызначаецца яшчэ двума фактарамі. Адзін фактар – наяўнасць двух вялікіх арэалаў: Палескага і Падняпроўскага, кожны з якіх мае яскравыя адметнасці ў абрадавай культуры, песенных стылях, народнай харэаграфіі, адзенні і інш., што адлюстравана ў адпаведных раздзелах абедзвюх кніг. Другі фактар – спалучэнне архаічных светапоглядных уяўленняў, вераванняў, магічных практык, абрадаў і звычаяў (выклікание дажджу, ваджэнне русалкі і інш.) з хрысціянскім веравучэннем, якое праяўляецца пераважна на ўзроўні маралі, прынцыпаў стварэння сям’і, выхавання дзяцей, стаўлення дзяцей да бацькоў, узаемастасункаў і ўзаемаадносін паміж людзьмі – словам, становіцца матывацыяй паводзін і міжасабовых адносін пры параўнальна малой (у супастаўленні з Брэстчынай, Гродзеншчынай, Заходняй Міншчынай) увацаркоўленасці сельскага насельніцтва.

Структура заключнага тома аналагічная структуры тамоў папярэдніх: ён таксама складаецца з дзвюх кніг, змест якіх дазваляе падаць аўтэнтычную народную культуру сучаснай Гомельшчыны ў разнаквецці шматлікіх лакальных праяў. Чатыры асноўныя раздзелы першай кнігі прысвечаны адпаведна каляндарным і сямейным традыцыям, пазаабрадавай песні і інструментальнай музыцы. Ім папярэднічае гістарычная, геаграфічная і этнакультурная характарыстыка рэгіёна, пададзеная ў артыкуле В. Цітова “Гомельскае Палессе і Падняпроўе”. Другая кніга раскрывае рэгіянальныя асаблівасці танцавальнага фальклору, народных гульняў, прозы, малых жанраў фальклору, замоў, традыцыйнага адзення і традыцыйнага народнага тэкстылю.

Удзельная вага двух першых раздзелаў першай кнігі – “Каляндарныя святы, звычаі і абрады” (Т.В. Валодзіна, Т.І. Кухаронак, І.Ю. Смірнова) і “Сямейныя звычаі і абрады” (Т.Б. Варфаламеева) – адпавядае той ролі, якую святы, звычаі і абрады гадавога і жыццёвага цыклаў працягваюць адыгрываць у культуры сучасных вяскоўцаў Гомельскага Палесся і Падняпроўя, выяўляючы пры гэтым рысы культурнай самабытнасці рэгіёна. Так, у параўнанні з агульнабеларускімі адпаведнікамі яркую рэгіянальную адметнасць Гомельшчыны складае абрадавы комплекс шчадравання/калядавання з архаічнымі маскамі, гульнёй-паказам “казы”, песнямі. Добра захоўваюцца ў памяці носьбітаў традыцый заключныя прыпеўкі ці куплеты, што прымыкаюць да асноўных калядных песень і змяшчаюць добрыя пажаданні, просьбу абдарыць, а таксама падзячныя формулы за калядныя дары. Для некаторых паўднёва-ўсходніх раёнаў падняпроўскага арэала Гомельшчыны характэрны рытуальныя абходы шчадроўнікаў з парай маскіраваных персанажаў – Васілём і Маланкай, якія не сустракаюцца на астатняй тэрыторыі Беларусі, але шырока распаўсюджаны ва Украіне. У Гомельскім Падняпроўі да Шчодрага вечара была прымеркавана своеасаблівая гульня моладзі з кашай.

Каляндар Гомельскага Палесся і Падняпроўя вылучаецца найперш сваім веснавым “модусам мыслення”, г. зн. асаблівай распрацаванасцю, сэнсавай шматпланавасцю, багаццем формаў і факусіраваннем у святах веснавога цыкла ледзь не ўсіх ідэй каляндарнай звычаёвасці. Гуканне вясны, характэрнае перадусім для гэтай тэрыторыі, распачыналася яшчэ на Стрэчанне і працягвалася да самага Вялікадня. Веснавыя звычаі і песні сталі своеасаблівым гімнам жыццю ва ўсіх яго складніках – у сям’і і каханні, у руплівай працы на полі і чаканні ўраджаю, у гадоўлі статка і гаспадарчых будзённых клопатах. Разам з тым да сённяшняга дня захаваліся і лакальныя выразныя веснавыя абрады. Так, Гомельшчына адметная сваім Тураўскім карагодам на Юр’я, абрадамі ваджэння і пахавання стралы, якія распачынаюцца ад Благавешчання і замыкаюць веснавы цыкл на Ушэсце, провадамі русалкі, што здзяйсняліся на паслятраецкім тыдні.

Восеньскі цыкл на тэрыторыі рэгіёна вызначаецца абрадамі так званай “свячы”, якая разумеецца ў традыцыйнай культуры перш за ўсё як калектыўны аброк, сродак забеспячэння сабе здароўя і дабрабыту на год наступны. Да характэрнай асаблівасці даследуемага рэгіёна можна аднесці шматлікасць, стабільнасць, разнастайнасць памінальных Дзядоў і свят першазім’я. У той жа час на Гомельшчыне амаль невядомы валачобны абрад і слаба развіты абрад Купалля.

Раздзел “Сямейныя звычаі і абрады” прысвечаны трыядзе абрадаў жыццёвага цыкла – радзінам, вяселлю і пахаванню, якія ў кантынууме традыцыйнай культуры беларусаў Гомельшчыны займаюць такое ж фундаментальнае месца, як і абрады цыкла каляндарнага. Нягледзячы на выразную тэндэнцыю да рэдукцыі і пераасэнсавання на новы лад многіх элементаў гэтых абрадаў, асноўны стрыжань кожнага з іх захоўвае надзвычайную ўстойлівасць, лакальную варыятыўнасць і жыццёвую актуальнасць, што і пацвярджаюць матэрыялы раздзела. Рэгіянальная спецыфіка, уласцівая кожнаму з абрадаў, мае найбольш выразныя рысы ў вяселлі, якое змяшчае мноства кампанентаў у абрадавым складзе і парадку вядзення абраду, атрыбутах, сюжэтах і напевах песень, характэрных толькі для рэгіёна Гомельскага Палесся і Падняпроўя.

Каляндарны і сямейны раздзелы насычаны песнямі. Пададзеныя як адзін з кампанентаў гэтых цыклаў, яны разам з тым даюць дастаткова поўнае ўяўленне аб найбольш распаўсюджаных у цяперашні час і рэгіянальна адметных сюжэтна-тэматычных, музычна-стылявых і музычна-тыпалагічных комплексах. Дзякуючы палітэкставай прыродзе тыпавых абрадавых напеваў, згодна з якой на адзін напеў могуць выконвацца дзясяткі тэкстаў розных сюжэтаў (але пэўнай складовай структуры), можна музычна "агучыць" практычна ўсе тэксты абрадавых песень, што і зроблена ў гэтых раздзелах. Пры гэтым тыповыя напевы, асабліва вясельныя, якія ў сучаснай народнапесеннай практыцы рэгіёна захаваліся асабліва поўна, пададзены ў сукупнасці іх варыянтаў, што, з аднаго боку, раскрывае музычна-стылявую адметнасць вясельных напеваў падняпроўскага і палескага арэалаў, а з другога – паказвае іх разнастайнасць унутры кожнага арэала.

Пласт песеннай лірыкі і ліраэпікі, узоры якіх складаюць змест раздзела "Пазаабрадавыя песні" (Т. Варфаламеева), у рэгіёне Гомельскага Палесся і Падняпроўя яскрава адлюстроўвае такую ўласцівую ўсёй народнапесеннай традыцыі беларусаў рысу, як шчыльная сувязь абрадавага і пазаабрадавага цыклаў. Яна прасочваецца і на ўзроўні песеннай паэтыкі, і на ўзроўні інтанацыйнай сферы. Прыведзеныя тут узоры ранняй (аднагалоснай) і больш позняй (шматгалоснай) традыцыі адлюстроўваюць таксама разнастайныя стылі дзвюх асноўных формаў спеваў – адзіночнай і гуртавой і даюць уяўленне аб распаўсюджаных тут жанравых і сюжэтна-тэматычных групах: песні любоўныя, сямейна-бытавыя, сацыяльна-бытавыя, балады, жартоўныя, калыханкі.

Культура сучаснага аўтэнтычнага музіцыравання на народных інструментах пададзена ў раздзеле "Інструментальная музыка" (М. Козенка). Як і ў папярэдніх тамах серыі, аўтар характарызуе рэгіянальныя асаблівасці гэтага віду народнага мастацтва на сучасным этапе яго бытавання ў адзінстве трох складнікаў – музычны інструмент, музыкант, музыка. Узоры, прадстаўленыя ў раздзеле, раскрываюць функцыі інструментальнай музыкі ў побыце сучаснай вёскі паўднёва-ўсходняй часткі Беларусі, яе жанры, сольную і ансамблевую традыцыі. Увага да арэальнага аспекту даследавання дазваляе выявіць некаторыя характэрныя рысы інструментальных традыцый, уласцівыя як палескай, так і падняпроўскай частка́м Гомельшчыны.

Завяршаюць першую кнігу "Звесткі пра запісы песень і інструментальнай музыкі", якія змяшчаюць даныя аб функцыянальнай прыналежнасці кожнага ўзору, часе і месцы запісу, імёнах і прозвішчах інфармантаў.

Панарама аўтэнтычнага танцавальнага мастацтва Гомельскага Палесся і Падняпроўя разгортваецца ў раздзеле "Танцавальны фальклор" (М. Козенка), які пачынае другую кнігу тома. Як і паўсюдна на Беларусі, у даследуемым рэгіёне харэаграфічная традыцыя існуе ў сукупнасці трох самастойных падсістэм – карагодаў, танцаў, скокаў, кожная з якіх разглядаецца ў адзінстве функцыянальнага прызначэння, жанравых адметнасцей, стылявых характарыстык і выканальніцкіх складаў. Так, карагодная традыцыя Гомельшчыны (асабліва яе падняпроўскай часткі) пераважна ўпісана ў веснавы час каляндарнага кола, і ў гэтым яе яскравая адметнасць у параўнанні з аналагічнымі традыцыямі іншых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў.

Асаблівасцю танцавальнай традыцыі з'яўляецца вялікая колькасць кадрыляў на 2, 4 і 6 пар, а таксама танцаў тройкамі: так выконваецца, напрыклад, пашыраны на Беларусі танец "Базар", які ў іншых рэгіёнах вядомы

толькі як парны танец. Сярод абрадавых танцаў для палескай часткі рэгіёна адметны вясельныя танцы “На чэраве” (тып “Жабкі”), “Чобаты”. Тут існуюць і характэрныя толькі для гэтага рэгіёна назвы танцаў: “Трыдану́”, “Нісені́чэнька”, “Чабурок” і інш.

Змест раздзела “Народныя гульні” (М. Козенка) складаюць шматлікія гульні, адны з якіх дакладна прымеркаваны да пэўнага часу ці абставін (калядныя, велікодныя, юраўскія, вясельныя і інш.), другія выконваюцца на працягу ўсяго года ў любы зручны час. Прадстаўлены гульні для дзяцей, падлеткаў і моладзі дашлюбнага ўзросту, гульні на развіццё сілы, спрыту, каардынацыю рухаў, кемлівасць, назіральнасць і іншыя фізічныя і псіхалагічныя ўласцівасці маладых людзей. У сучасным побыце моладзі Гомельшчыны гульні як старажытнага паходжання, так і больш позняга часу застаюцца жывой, актуальнай з’явай.

Раздзел “Народная проза” (А. Боганева) змяшчае поўны набор вядомых жанраў: казкі ўсіх разнавіднасцей, легенды, паданні, былічкі, вусныя бытавыя расказы, розныя міжжанравыя ўтварэнні. Калі выказаць ураженне ад народнапразаічнай традыцыі Гомельшчыны ў цэлым – гэта разнастайнасць, багацце, яскравасць.

Рэгіянальная спецыфіка народнай прозы традыцыйна праяўляецца ў такіх жанравых разнавіднасцях, як этыялагічныя легенды і былічкі.

Сярод этыялагічных легенд выразную спецыфіку Гомельшчыны (раёны Заходняй і Цэнтральнай Гомельшчыны) маюць легенды аб паходжанні чарапахі, якія практычна не сустракаюцца ў іншых абласцях і рэгіёнах Беларусі, што цалкам вытлумачальна арэалам распаўсюджання еўрапейскай балотнай чарапахі: у прыродных умовах яна сустракаецца ў арэале ад Паўночна-Заходняй Афрыкі і Паўночнага Ірана на поўдні да беларускага Цэнтральнага і часткі Усходняга Палесся – на поўначы. Сярод сюжэтаў легенд аб паходжанні зязюлі найчасцей сустракаецца разнавіднасць пра мужа-вужа.

Былічкі ўтвараюць выразныя арэалы па наступных персанажна-атрыбутыўных кодах: былічкі пра расліны-апатрапеі буркун і тою (руту і тою), як і былічкі пра вужа-цара, пашыраны пераважна ў раёнах Цэнтральнага Палесся – Лельчыцкім, Жыткавіцкім, Петрыкаўскім; былічкі пра дабрахожых лакалізуюцца толькі на Гомельска-Бранскім памежжы – у Чачэрскім і Веткаўскім раёнах (левабярэжжа ракі Сож, населеныя пункты па рацэ Іпуць), прыкладна ў арэале абрада “Ваджэнне стралы”.

Раздзел “Малыя жанры фальклору” (Т. Валодзіна) традыцыйна ўключае россып узораў народнай мудрасці – прыказак, прымавак, загадак. Прадстаўленыя тут прыгаворы ва ўсім багацці сваіх формаў і шырыні адлюстраванага матэрыялу напаўняюць будні з іх штодзённымі гаспадарчымі клопатамі, асабліва шчыльна насычаюць здарэнні, якія парушалі мерны ход жыцця і стваралі крытычныя сітуацыі (хваробы, засуха, пажар, далёкія выправы і г.д.). У той жа час гэтыя кароткія магічныя тэксты вылучаюцца яскравай паэтычнай выразнасцю.

Пераказы сноў, нягледзячы на адлюстраваны там асабісты для кожнага вопыт, разгортваюць уласцівыя традыцыйнаму светапогляду ўяўленні пра “той свет”, пра спосабы і магчымасці камунікацыі з ім. У снах знаходзіць увасабленне надзвычай архаічная, нават архетыпічная сімволіка розных з’яў і прадметаў. Апавяданні пра сны ў вуснах таленавітых расказчыкаў становяцца ўзорамі вобразнасці і маўленчай дасканаласці.

Гомельшчына, і асабліва падняпроўская яе частка, з’яўляецца рэгіёнам “адкрытай” народнамедыцынскай лекавальнай практыкі, дзе вясковыя знахаркі ахвотна дзеляцца сваімі ведамі і перш за ўсё замовамі, якія паўстаюць як сапраўдныя шэдэўры народнай творчасці. Пры ўсёй сваёй выразнай прагматычнай функцыі замовы тут разгорнутыя, надзвычай багатыя сюжэтна, матыўна, насычаныя яркімі вобразамі і характарыстыкамі. У раздзеле “замовы” яны падаюцца побач з апісаннямі рытуальна-магічнай лекавальнай практыкі, што дазваляе стварыць аб’ёмную панараму вясковага лекавання, жывую і да сённяшняга дня. У раздзел уключаны шэраг замоў і рэкамендацый з галіны народнай ветэрынарыі, якая сваёй актуальнасцю і запатрабаванасцю ў вясковым асяродку сведчыць пра жывучасць і багацце традыцыйных міфапаэтычных уяўленняў.

У раздзеле “Традыцыйнае адзенне” (І. Смірнова) народны касцюм Гомельшчыны разглядаецца ў адпаведнасці з прыналежнасцю да падняпроўскай або палескай часткі рэгіёна. Даследаванне дазваляе вызначыць наступныя традыцыйныя строі адзення: брагінскі, буда-кашалёўскі, неглюбскі, краснапольскі (Падняпроўе); турава-мазырскі, калінкавіцкі (Цэнтральнае Палессе). Па выніках экспедыцыйных даследаванняў аўтарам у палескай частцы Гомельшчыны вылучаны таксама ельска-нараўлянскі строй.

Брагінскі строй бытаваў пераважна ў паўднёва-ўсходніх раёнах Гомельшчыны – Брагінскім, Лоеўскім, Хойніцкім. Тэрыторыя распаўсюджання буда-кашалёўскага строю ахоплівала Буда-Кашалёўскі, Гомельскі, Рэчыцкі раёны. Неглюбскі строй бытаваў у XIX – сярэдзіне XX ст. на ўсходзе Веткаўскага раёна, а таксама на поўдні Краснапольскага і паўночным захадзе Навазыбкаўскага раёнаў Бранскай вобласці РСФСР. Адзенне краснапольскага строю на тэрыторыі Гомельшчыны існавала толькі ў Чачэрскім і памежных з ім раёнах. Турава-мазырскі строй займаў значную тэрыторыю: быў распаўсюджаны ў Жыткавіцкім, Лельчыцкім, Мазырскім, Петрыкаўскім раёнах. Калінкавіцкі строй быў пашыраны на тэрыторыі Калінкавіцкага, Светлагорскага, Жлобінскага, Акцябрскага, часткова Мазырскага і Рагачоўскага раёнаў. Ельска-нараўлянскі строй бытаваў на тэрыторыі Ельскага і Нараўлянскага раёнаў.

У раздзеле вялікая ўвага удзяляецца вызначэнню асаблівасцей традыцыйнага касцюма розных лакальных традыцый рэгіёна, удакладненню межаў лакальных варыянтаў асобных строяў. Разглядаюцца этапы і працэсы трансфармацыі вясковага касцюма Гомельшчыны ў XIX і XX ст., даследуецца функцыянаванне касцюма ў сялянскім асяроддзі.

У раздзеле “Традыцыйны народны тэкстыль” (В. Лабачэўская) на падставе вывучэння музейных збораў і сабраных палявых матэрыялаў аналізуюцца мастацкія традыцыі народнага ткацтва і вышыўкі, асаблівасці арнаментацыі і характар бытавання народных тканін на Гомельшчыне.

Гомельшчына вылучаецца надзвычайным багаццем і разнастайнасцю тэкстыльных мастацкіх традыцый. Для традыцыйных тканін (ручнікі, прадметы адзення) характэрна ўжыванне шырокага спектра ткацкіх тэхнік: бранай, закладной, выбарнага і розных відаў перабору і іх спалучэнне ў адным вырабе. У меншай ступені на Гомельшчыне ва ўжытку было шматнітовае ткацтва; тут не ткалі тканін больш чым на 4 і 8 нітах.

Ва ўсходніх раёнах Гомельшчыны склаліся выразныя лакальныя тыпы падняпроўскіх ручнікоў: чачэрскія, неглюбскія, добрушскія і буда-каша-

лёўскія. Для іх характэрны багаты арсенал арнаментальных матываў, дэкаратыўнасць кампазіцый і насычанасць чырвоным колерам. Мастацка-тэхналагічныя асаблівасці тканых вырабаў у падняпроўскіх раёнах у пэўнай ступені абумоўлены ўплывам мануфактурнага і саматужнага ткацтва, якое ў XVIII–XIX стст. існавала ў Гомелі, Добрушы, Чачэрску. Пачынаючы з XVII ст. назіраўся моцны ўплыў кілімавага ткацтва, што было распаўсюджана на суседняй тэрыторыі Украіны – у Чарнігаўшчыне, Ровеншчыне і садзейнічала фарміраванню такіх выразных з'яў народнага тэкстылю, як рагачоўскія і брагінскія закладныя ручнікі.

Традыцыйнае адзенне падняпроўскай часткі Гомельшчыны дэманструе багаты арсенал тэхнік вышыўкі: набор, лікавая гладзь, крыжык, злучальныя швы, зборкі і вышыўка па іх. Багаццем арнаментыкі і тэхналагічных прыёмаў выканання вылучаюцца ручнікі і традыцыйны касцюм Калінкавіцкага і Светлагорскага раёнаў.

У палескай частцы рэгіёна сялянскія жанчыны да сённяшняга дня захапляюцца вышыўкай адвольнай гладдзю і ствараюць яскравыя паліхромныя інтэр'еры з вялікай колькасцю вышыванак: падузорнікаў, накідак на падушкі, абрусаў, фіранак, сурвэтак. Вышыўка гладдзю сфарміравала сучасны варыянт жаночага строю, які да нядаўняга часу быў у жывым ужытку ў вёсках Жыткавіцкага і Лельчыцкага раёнаў.

У другой палове XX ст. амаль паўсюдна на Гомельшчыне ткалі дэкаратыўныя паліхромныя посцілкі ў тэхніках пераборнага ткацтва. У в. Неглюбка Веткаўскага раёна традыцыі ткацтва бытавалі і плённа развіваліся да 1980-х гг.

Да першай кнігі дададзены аўдыядыск (складальнік І. Мазюк), у якім змешчаны ўзоры каляндарных, сямейна-родавых, пазаабрадавых песень і інструментальнай музыкі, запісаныя ад аўтэнтычных выканаўцаў (салістаў і гуртоў) у розных раёнах вобласці.

Электронны дадатак другой кнігі змяшчае аўтэнтычныя запісы народнай прозы ў выканані носьбітаў традыцый (складальнік А. Боганева).

* * *

Аўтарскі калектыў выдання выказвае шчырую падзяку ўсім, хто на працягу даследчай работы і падрыхтоўкі абедзвюх кніг да друку аказваў фінансавую, транспартную, арганізацыйную падтрымку і дапамогу: Гомельскаму аблвыканкаму, начальніку ўпраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама А.Г. Рыжкову, дырэктару ўстановы "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" М.І. Шамшэні, кіраўнікам і супрацоўнікам аддзелаў культуры і метадычных цэнтраў вобласці, дзе працавалі нашы фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі.

За прадастаўленыя архіўныя матэрыялы, выкарыстаныя ў выданні, дзякуем метадычным цэнтрам аддзелаў культуры Буда-Кашалёўскага, Ельскага і Лельчыцкага райвыканкамаў, а таксама метадысту першай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі "Інстытут культуры Беларусі" В.І. Басько.

# ЗМЕСТ

ПРАДМОВА . . . . . . . . . . 5

ГОМЕЛЬСКАЕ ПАЛЕССЕ І ПАДНЯПРОЎЕ. *В.С. Цітоў* . . . . . . . . . . 12

КАЛЯНДАРНЫЯ СВЯТЫ, ЗВЫЧАІ І АБРАДЫ. *Т.В. Валодзіна, Т.І. Кухаронак, І.Ю. Смірнова* . . . . . . . . . . 23

**ЗІМОВЫЯ СВЯТЫ, ЗВЫЧАІ І АБРАДЫ** . . . . . . . . . . 43

**Каляды** . . . . . . . . . . 43

У чаканні свята . . . . . . . . . . 43
Першая куцця . . . . . . . . . . 46

**Ражаство** . . . . . . . . . . 52

**Новы год** . . . . . . . . . . 53

Шчодры вечар . . . . . . . . . . 53
Варожбы . . . . . . . . . . 55
Свавольствы моладзі . . . . . . . . . . 60
Калядныя абходы . . . . . . . . . . 60
Калядныя вячоркі . . . . . . . . . . 90

**Вадохрышча** . . . . . . . . . . 99

**Стрэчанне** . . . . . . . . . . 104

Гуканне вясны на Стрэчанне . . . . . . . . . . 106

**Песні зімы.** *Т.Б. Варфаламеева*. . . . . . . . . . . 113

**ВЕСНАВЫЯ СВЯТЫ, ЗВЫЧАІ І АБРАДЫ** . . . . . . . . . . 158

**Масленіца** . . . . . . . . . . 158

Масленічныя дзяды . . . . . . . . . . 158
Масленічныя стравы . . . . . . . . . . 158
Масленічныя гулянні . . . . . . . . . . 159
Гуканне вясны на Масленіцу . . . . . . . . . . 161
Чырачка . . . . . . . . . . 162
Запускі (Запусты, Загавіны) . . . . . . . . . . 163

**Вялікі пост** . . . . . . . . . . 164

**Абраценне** . . . . . . . . . . 165

**Аўдокі** . . . . . . . . . . 165

**Саракі** . . . . . . . . . . 166

Гуканне вясны на Саракі . . . . . . . . . . 168

**Аляксей** . . . . . . . . . . 171

**Серадапосце, сярэдахрэсце** . . . . . . . . . . 173

Пахвальная нядзеля . . . . . . . . . . 173

**Благавешчанне** . . . . . . . . . . 174

Забароны і правілы . . . . . . . . . . 174
Адкрыванне зямлі . . . . . . . . . . 176
Бусел у абраднасці Благавешчання . . . . . . . . . . 177
Гуканне вясны і спевы на Благавешчанне . . . . . . . . . . 177
Ваджэнне стралы . . . . . . . . . . 182
Паленне вогнішчаў . . . . . . . . . . 183

**Вербніца** . . . . . . . . . . 184

**Белая нядзеля** . . . . . . . . . . 186

Чысты чацвер . . . . . . . . . . 187
    “Чароўныя” рэчы . . . . . . . . . . 189
    Малая Усяношная . . . . . . . . . . 190
    Чацвергаванне . . . . . . . . . . 191
Вялікая (Красная) пятніца . . . . . . . . . . 191
Красна(я) субота . . . . . . . . . . 192

**Вялікдзень** . . . . . . . . . . 193

Велікодныя вогнішчы . . . . . . . . . . 194
Ігра сонца . . . . . . . . . . 195
Разгаўленне . . . . . . . . . . 196
Наведванне могілак . . . . . . . . . . 197
Абмен падарункамі . . . . . . . . . . 198
Велікодныя гульні . . . . . . . . . . 199
Велікодныя абходы . . . . . . . . . . 200
Карагоды . . . . . . . . . . 201
    Ваджэнне стралы/сулы . . . . . . . . . . 202
    “Конопелюшка” . . . . . . . . . . 204
    “На сена” . . . . . . . . . . 205
    “Хрэн” . . . . . . . . . . 205

“Проса” . . . 206
“Кроп” . . . 206

**Велікодны тыдзень** . . . 207

Градавая серада. Сухі чацвер . . . 207
Мяртвых Вялікдзень . . . 208
Праводная нядзеля . . . 210
Радунічныя дзяды . . . 211
Радуніца . . . 212
Кармленне душ . . . 214

**Юр’я** . . . 215

Земляробчы цыкл юраўскіх абрадаў . . . 216
Абходы нівы . . . 216
Тураўскі карагод . . . 217
Жывёлагадоўчы цыкл юраўскіх абрадаў . . . 220
Першы выган жывёлы . . . 220
Сумесная трапеза ў полі . . . 223
Раса ў юраўскіх звычаях . . . 223
Прастольнае свята . . . 224
Паленне вогнішчаў . . . 225

**Мікола веснавы** . . . 225

**Ушэсце** . . . 226

Карагоды . . . 228
Ваджэнне і пахаванне стралы . . . 231

**Тройца** . . . 235

Траецкія дзяды . . . 235
Траецкая зяляніна . . . 236
Гулянні . . . 239
Хрэсны ход . . . 242

**Русальны тыдзень** . . . 243

Градавая серада і Сухі чацвер . . . 246
Провады русалкі . . . 246
Аброчны дзень . . . 249

**Дзевятуха** . . . 249

**Песні вясны.** *Т.Б. Варфаламеева* . . . 250

**ЛЕТНІЯ СВЯТЫ, ЗВЫЧАІ І АБРАДЫ** . . . 309

**Купалле** . . . 309

Збор і асвячэнне зёлак . . . 309
Гульні маскіраваных . . . 310
Вянкі . . . 311
Варажба . . . 311
Засцярогі ад ведзьмаў . . . 313
Купальская ноч . . . 317
Купальскае вогнішча . . . 317
Свавольствы моладзі . . . 321

Пошукі папараць-кветкі . . . 321
Рытуальнае абліванне . . . 323
Сустрэча ўзыходу сонца . . . 323

**Пятрок** . . . 323

Аброчны дзень . . . 325

**Ілля** . . . 326

**Жніўныя звычаі і абрады** . . . 327

Зажынкі . . . 328
Першы сноп . . . 332
Жніво . . . 333
Дажынкі . . . 337
“Барада” . . . 337
Дажынкавы вянок . . . 339
Апошні сноп . . . 340
Гулянні . . . 341

**Песні лета.** *Т.Б. Варфаламеева* . . . 342

**ВОСЕНЬСКІЯ СВЯТЫ, ЗВЫЧАІ І АБРАДЫ** . . . 367

**Першы Спас. Макавей** . . . 367

**Яблычны Спас** . . . 369

**Першая Прачыстая** . . . 371

**Галавасек** . . . 372

**Чуда** . . . 374

**Другая Прачыстая** . . . 376

**Уздзвіжанне** . . . 376

**Пакровы** . . . 378

**Казанская** . . . 380

**Дзяды** . . . 380

Памінальная вячэра . . . 382
Запрашэнні дзядоў на вячэру . . . 386
Правілы і забароны на Дзяды . . . 387

**Міхайла** . . . 388

**Піліпаўскі пост. Святы першазім’я** . . . 389

**Увядзенне** . . . 390

**Юр’я** . . . 391

**Андрэй** . . . 391

**Варвары** . . . 392

**Мікола** . . . 393

Свяча . . . 394
Піліпаўскія вячоркі . . . 399

**Песні восені.** *Т.Б. Варфаламеева* . . . 411

СЯМЕЙНЫНЯ ЗВЫЧАІ І АБРАДЫ. *Т.Б. Варфаламеева* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 427

**РАДЗІНЫ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 434

**Абрады і звычаі дародавага перыяду** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 434

**Роды** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 436

**Звычаі і абрады пасляродавага перыяду** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 438

Першае купанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 438
Выкормліванне. Абярэгі ад сурокаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 439
Адведкі. Кумы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 441
Хрышчэнне. Імянарачэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 442
Хрэсьбіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 444
Звычаі і абрады першага году жыцця дзіцяці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 449

**Песні ў абрадзе радзін** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 450

**ВЯСЕЛЛЕ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 458

**Перадвясельны перыяд** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 461

Сватанне, заручыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 461
Каравай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 474
Ёлка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 486

**Перыяд вяселля** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 493

Першы дзень вяселля . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 493
Малады збіраецца і едзе да маладой . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 493
Апрананне маладой . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 506
Прыезд маладога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 511
Вянчанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 544
Застолле ў хаце маладой. Падзел каравая . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 547
Ад’езд маладой да маладога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 555
Прыезд да маладога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 568
Завіванне маладой . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 576
Другі дзень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 581
Трэці і наступныя дні. Пярэзвы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 589

**ПАХАВАННЕ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 593

Падрыхтоўка да смерці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 593
Прадвесце смерці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 594
Перадсмяротны стан . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 594
Нябожчык у хаце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 597
Абмыванне і апрананне нябожчыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 598
Труна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 601
Развітанне з нябожчыкам у хаце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 604
Вынас труны. Шэсце на могілкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 605
На могілках . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 608
Памінальны “абед” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 610
Пра асаблівасці пахавання і памінання самагубцаў . . . . . . . . . . . . . . . 613

**Пахавальныя галашэнні** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 614

ПАЗААБРАДАВЫЯ ПЕСНІ. *Т.Б. Варфаламеева* . . . . . . . . . . 637

ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЯ МУЗЫКА. *М.А. Козенка* . . . . . . . . . . 749

**НАЙГРЫШЫ, ПРЫМЕРКАВАНЫЯ ДА АБРАДАЎ** . . . . . . . . . . 756

**Найгрышы, прымеркаваныя да вяселля** . . . . . . . . . . 756

**ПАЗААБРАДАВЫЯ НАЙГРЫШЫ** . . . . . . . . . . 769

**Сольныя найгрышы** . . . . . . . . . . 769

Скрыпічныя найгрышы . . . . . . . . . . 769

Гармонікавыя найгрышы . . . . . . . . . . 799

Баянныя найгрышы . . . . . . . . . . 842

**Ансамблевыя найгрышы** . . . . . . . . . . 853

**ЗВЕСТКІ ПРА ЗАПІСЫ ПЕСЕНЬ І ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЙ МУЗЫКІ** . . . 880

Навуковае выданне

**Валодзіна** Таццяна Васільеўна
**Варфаламеева** Тамара Барысаўна
**Козенка** Мікалай Аляксеевіч і інш.

ТРАДЫЦЫЙНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ

**У шасці тамах**

**Том 6**

**ГОМЕЛЬСКАЕ ПАЛЕССЕ І ПАДНЯПРОЎЕ**

**У дзвюх кнігах**

**Кніга 1**

Рэдактар *Л.М. Макейчык*
Мастацкі рэдактар *Т.В. Шабунька*
Тэхнічныя рэдактары *М.У. Брыгер, А.М. Бабянкова*
Карэктары *В.І. Аверкіна, Н.Г. Баранова, А.І. Галдзенкова, Т.У. Кульніс, Т.К. Хваль*
Камп'ютэрная вёрстка *А.М. Бабянковай, І.У. Вайцэховіч, Ю.М. Трусевіч*
Рэдагаванне нотнага матэрыялу *А.У. Рашчынскага*
Набор нот *Т.С. Васільевай*

Падпісана ў друк 27.12.2012. Фармат 70×100/16. Папера афсетная.
Гарнітура «Newton». Афсетны друк. Ум. друк. арк. 74,1.
Ул.-выд. арк. 70,5. Тыраж 1200 экз. Заказ 457.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Вышэйшая школа”».
ЛИ № 02330/0494062 ад 03.02.2009.
Пр. Пераможцаў, 11, 220048, Мінск.
e-mail: market@vshph.com http://vshph.com

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я.Коласа».
ЛП № 02330/0150496 от 11.03.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

**Традыцыйная** мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 6.
Т65 Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн. 1 / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2012. – 910 с. : каляр. іл.
ISBN 978-985-06-2201-3.

Шосты том, які завяршае серыю выданняў "Традыцыйная мастацкая культура беларусаў", прысвечаны рэгіёну Гомельскага Палесся і Падняпроўя і прадстаўляе аўтэнтычныя формы народнай культуры на аснове матэрыялаў, зафіксаваных у комплексных фальклорна-этнаграфічных экспедыцыях 2003–2007 гг. вядучымі даследчыкамі беларусай народнай культуры, у першую чаргу супрацоўнікамі дзяржаўнай навуковай установы "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі".

У першую кнігу ўвайшлі матэрыялы, якія даюць уяўленне аб сучасным стане такіх асноўных відаў мясцовай традыцыйнай культуры, як каляндарныя і сямейныя звычаі і абрады, песенны і інструментальны фальклор. Выданне ілюстравана фатаграфічнымі і нотнымі матэрыяламі. Электронны дадатак змяшчае песні і інструментальную музыку.

Для навукоўцаў-гуманітарыяў, выкладчыкаў і студэнтаў вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, настаўнікаў, работнікаў культуры, кіраўнікоў прафесійных і аматарскіх мастацкіх калектываў, шырокага кола зацікаўленых беларускім традыцыйным мастацтвам.

**УДК 39(=161.3)+398.3+392](476.2)**
**ББК 63.5(4Беи)**